МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

27 сакавіка 2020 г. № 12 (548)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

Арыентацыя на спажыўца

Фота БелТА.

Каб павысіць попыт на прадукцыю ААТ «Камволь», тут распрацавалі адмысловую стратэгію прыцягнення ўвагі пакупніка

З тым, якія вынікі прынесла праведзеная не так даўно мадэрнізацыя прадпрыемства, што хвалюе калектыў і перспектывамі далейшага развіцця вытворчасці, пазнаёмілася старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаная па горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА, якая наведала гэтае адкрытае акцыянернае таварыства ў сераду, 25 сакавіка.

Быць у трэндзе

Нагадаем, што ў 2017 годзе, згодна з указам Прэзідэнта краіны, на камбінаце праводзіліся мадэрнізацыя і рэканструкцыя новай вытворчасці па выпуску канкурэнтаздольных тканін бізнес- і эканомкласаў. Маштабная мадэрнізацыя завяршылася, і на сёння прадпрыемства можа прапанаваць спажыўцам шырокі асартымент тканін розных відаў: для дзелавых касцюмаў, прывабных сукенак, модных спадніц і гэтак далей. Калектыў прадпрыемства — а гэта 760 чалавек — цяпер працуе ў двухзменным рэжыме. Попыт на прадукцыю ёсць, але, акрамя выпуску тканін, трэба быць у трэндзе модных тэндэнцый і запатрабаванняў рынку, каб адпавядаць сучасным густам. Менавіта выпуск гатовай швейнай прадукцыі — а такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы — дазваляе арыентавацца ў спажывецкіх запытах, а таксама вырабляць прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю, што, безумоўна, адбіваецца на росце даходаў акцыянернага таварыства. Так з'явілася ідэя самастойнага пашыву моднай прадукцыі са сваіх тканін і, адпаведна, арганізацыі новага кірунку на камбінаце — работы дызайн-цэнтра.

стар. 2

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

АГУЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

Ці патрэбны змяненні ў рабоце з даўжнікамі жыллёва-камунальных паслуг?

Каб спагнаць запазычанасць з даўжнікоў, заканадаўствам прадугледжаны пэўны механізм узаемадзеяння самых розных службаў — ад разлікова-даведачных цэнтраў і аддзелаў прымусовага выканання да пастаўшчыкоў паслуг і нават міліцыі (пра гэта «МС» пісала ў № 10 за 13 сакавіка). Здаецца, працэс наладжаны і ўсё павінна працаваць як гадзіннік.

Аднак усе памятаюць рэзанансную навіну, калі ў кватэры на сталічнай вуліцы Пляханава знайшлі памерлую адзінокую жанчыну, якая не плаціла за паслугі з 2017 года. І больш за ўсё суседзяў неплацельшчыцы спалохала тое, што ў памяшканні гарэла фаерка і была ўключана вада...

стар. 4

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Парламенцкі сезон — 2020

Да адкрыцця вясенняй сесіі застаецца менш чым тыдзень. Што ў заканадаўчым партфелі? стар. 3

Усё сваё!

Дапамога асабістым падсобным гаспадаркам — у дзяржаўным прыярытэце. стар. 13

Прыбыткі і выдаткі

Ці патрэбны камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы пры сельвыканкамах? стар. 13

Выбар года

Старэйшына з маленькай вёскі ў Жлобінскім раёне, што на Гомельшчыне, паказала, на што здольная ініцыятыва. стар. 15

7 тысяч дрэў і мільён кветак

Як магілёўскія дэпутаты разам з камунальнікамі і жыхарамі наводзяць прыгажосць у горадзе. стар. 16